ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
30
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 27(1513)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

тэлетайп

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

Заўтра

пройдзе XXXV справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя студэнтаў. Нумар газеты прысвечаны гэтай падзеі.

◆

Бюро парткома

на чарговым пасяджэнні разгледзела пытанне «Аб рабоце партарганізацыі факультэта прыкладной матэматыкі па ўдасканаленню вучэбнага працэсу і падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў». Разам з адзначанымі пэўнымі поспехамі бюро парткома вызначыла шэраг аб'ектыўных перашкод у рабоце факультэта, звязаных з недахопам аўдыторных фондаў, нізкай забяспечанасцю вылічальнай тэхнікай і інш. Прыняты меры па выпраўленню становішча.

У. САТОЛІН,
інструктар парткома.

Сёння

«Палітыкус» — дыскусійны інтэрнацыянальны клуб праводзіць чарговае пасяджэнне пад назвай «Савецкі Саюз вачыма замежнага друку на сучасным этапе». На пасяджэнне запрашаюцца ўсе жадаючыя. Яно адбудзецца ў 206-й аўдыторыі ў 20 гадзін.

А. САМУЙЛІЧ.

Секцыя

падрыхтоўкі інструктараў па рацыянальнаму чытанню ў новым вучэбным годзе адкрываецца на факультэце грамадскіх прафесій. Курс падрыхтоўкі інструктараў разлічаны на 2 гады. На працягу першага года слухачы навучацца рацыянальнай працы з кнігай, разгледзяць тэарэтычныя пытанні, набудуць практычныя навыкі. На працягу другога года навучання слухачы паглыбяць тэарэтычныя веды, адпрацуюць методыку вядзення індывідуальных і групавых заняткаў, падрыхтуюць неабходны для наступнай работы дыдактычны матэрыял.

Заняткі будуць праводзіцца адзін раз у тыдзень.

У канцы кожнага года заняткаў прадугледжаны залік: у канцы першага года — рэферат па адной з прапанаваных тэм і кантрольнае чытанне ў адпаведнасці з устаноўленымі нормамі хуткасці чытання і разумення прачытанага. У канцы другога года навучання слухач дае 2—3 пробныя урокі і адзін заліковы.

К. КУНЦЭВІЧ,
дэкан факультэта грамадскіх прафесій.

ДЭЛЕГАТ ПРАФСАЮЗНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

ЗНАЁМЦЕСЯ: дэлегат прафсаюзнай канферэнцыі Таццяна Мацкевіч. Яна ўзначальвае арганізацыйна-масавую камісію прафбюро механіка-матэматычнага факультэта.

Зваротная сувязь

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

ПРА РАБОТУ СТУДЭНЦКАГА ПРАФКОМА БДУ РАСКАЗВАЕ ЯГО СТАРШЫНЯ АДАМ ДАНІЛАВІЧ КІШКЕВІЧ.

— Адам Данілавіч, падводзяцца вынікі работы прафсаюзнай арганізацыі за мінулыя два гады. Што змянілася за гэты час у жыцці студэнтаў?

— Два гады — гэта не вельмі вялікі час, за які могуць адбыцца значныя змены. Тым не менш можна адзначыць паляпшэнне жыллёва-бытавых умоў. Уведзены ў эксплуатацыю інтэрнат № 8 на 500 месц. Заканчваецца рамонт інтэрната № 4. У карыстанне студэнцкіх сем'яў выдзелены другі паверх гэтага інтэрната.

Зусім нядоўга чакаць, калі студэнцкія інтэрнаты будуць пераведзены на самаабслугоўванне і самакіраванне. Першы вопыт набыты у інтэрнаце № 6 факультэта прыкладной матэматыкі.

Некалькі пашырыўся кантынгент адпачываючых у лагеры працы і адпачынку «Феадасійскі». Наш прафсаюз — гэта і студклуб з яго вялікай колькасцю гурткоў і калектываў мастацкай самадзейнасці, і спартыўны клуб, лагер на Нарачы, прафілакторый. Увогуле назіраюцца пазітыўныя перамены ў паляпшэнні ўмоў быту, адпачынку, аздараўлення студэнтаў.

Аднак трэба сказаць, што яшчэ многае належыць зрабіць, і перш за ўсё ў плане актывізацыі работы прафсаюзных груп, актывізацыі кожнага студэнта.

— XXVII з'езд КПСС вызначыў генеральную лінію ўдасканалення грамадства: паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця. Як гэта датычыць работы прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў універсітэта?

— Самым непасрэдным чынам. Галоўным фактарам, які вызначае тэмпы і якасць развіцця ўсіх бакоў жыцця, быў і застаецца чалавек. Падрыхтоўка шмодзённы і складаны працэс. На жаль, не ўсім аспектам гэтага працэсу надаецца належная ўвага.

Калі адказнасць за вучэбны працэс нясуць рэктарат, дэканаты, партбюро, камітэт камсамола, прафбюро факультэтаў, то арганізацыя адпачынку, быту, не гаворачы ўжо аб аздараўленні студэнтаў, застаецца сферай дзейнасці прафсаюзнага камітэта. Прынамсі, усе да гэтага настолькі прывыклі, што па многіх пытаннях нам не толькі не аказваецца падтрымка, але нават прыходзіцца сутыкацца з невыкананнем сваіх прамых абавязкаў сярод некаторых арганізацый. Для прыкладу спашлюся на работу студэнцкага гарадка, дырэкцыя якога выступае ў ролі органа, кантралюючага паводзіны студэнтаў і фіксуючага непаладкі ў інтэрнатах замест ролі арганізатара іх выпраўлення.

Пэўна, і наша недапрацоўка у гэтым ёсць. І калі службовыя асобы не выконваюць сваіх прамых абавязкаў, цяжка чакаць ад студэнтаў выканання загадаў і пастаноў органаў грамадскага самакіравання. А гэта ўсё ўваходзіць у шырокае кола пытанняў сацыяльнага і эканамічнага развіцця, паколькі канчатковая «прадукцыя» вучэбна-выхаваўчага працэсу — спецыяліст з універсітэцкай адукацыяй. Другімі словамі, ён павінен быць усебакова падрыхтаваны да працы ў выбранай галіне, што прадугледжвае не толькі пэўны запас ведаць іх, арганізоўваць людзей вакол справы.

Студэнцкі прафсаюзны камітэт вышэйшай навучальнай установы, выбраны на аснове Статута прафесіянальных саюзаў, прадстаўляе інтарэсы студэнтаў і слухачоў падрыхтоўчага аддзялення ў галіне навучання, працы, быту, адпачынку, культуры і карыстаецца правамі юрыдычнай асобы.

(З Пастановы Прэзідыума ВЦСПС).

— Ці азначае гэта, што неабходна больш абапірацца на самога студэнта ў яго падрыхтоўцы да будучай дзейнасці ў той ці іншай галіне народнай гаспадаркі?

— Безумоўна. Павінна быць актыўная зваротная сувязь ад студэнта. Нельга чакаць, калі ён «навучыцца», «стане» кваліфікаваным спецыялістам і толькі тады зможа даваць аддачу недзе па-за сценамі універсітэта. Трэба, каб кожны студэнт з моманту паступлення, атрымаўшы пэўныя ўмовы, удасканальваў іх і ўдасканальваўся сам. І тут без даверу, добразычлівых адносін да яго нельга дамагчыся жаданага выніку.

Давер і добразычлівасць — гэта аснова. Яна павінна быць трывалай, што непазбежна павышае адказнасць. Дарэчы, адказнасць перад таварышамі у першую чаргу. Усё гэта магчыма толькі пры ўмовах самастойнасці ў рашэнні большасці пытанняў, якія датычаць жыццядзейнасці студэнцкага калектыву. Іменна ў такіх абставінах магчыма асэнсаванне неабходнасці абапірацца на ўласныя сілы. Тут веды і ўменне ўвасабляюцца ў канкрэтныя справы, фарміруецца жыццёвая пазіцыя студэнта, будучага спецыяліста.

Ад таго, якім ён будзе, у многім залежаць тэмпы развіцця усіх галін нашага грамадства.

Інтэрв'ю правяла
С. ІОГАЛЬ.

ТОЛЬКІ КРАЕМ ВУХА?..

ПЯРВІЧНАЯ — ПЯРВІЧНА

Для нас, учарашніх школьнікаў, прафсаюзная работа з'явілася новай справай, якая паставіла шмат пытанняў. І сярод іх галоўнае: як арганізаваць жыццё групы, каб яно было цікавым і насычаным? Наладзіць работу нам дапамог прафком універсітэта, які арганізаваў вучобу прафгрупаў. Нас вучылі праверанным падыходам да арганізацыі прафсаюзных мерапрыемстваў.

Але на практыцы за кароткі час я зразумела, якая складаная і адказная мая работа.

РАЗГЛЯДАЦЬ вучэбныя пытанні нам прыходзілася не часта. У групе не было двоечнікаў і практычна ўсе студэнты вучацца на «добра» і «выдатна». Цяпер я думаю, што ў групе можна было б дамагчыся яшчэ лепшай паспяховасці.

На сённяшнім этапе асабліва востра стаіць праблема падрыхтоўкі спецыялістаў, якія адпавядаюць усім патрабаванням часу. Думаю, у сувязі з гэтым нашы студэнты звернуць самую сур'ёзную увагу на якасць сваіх ведаў. Гэтаму будзе садзейнічаць і сацспаборніцтва, на якое мы выклікаем у новым вучэбным годзе трэцюю групу нашага курса. Пытанне вучобы стане адным з пастаянна кантралюемых.

Найбольшы водгук у групе знаходзілі культурна-спартыўныя мерапрыемствы. Цікава прайшоў у нас дыспут «Інтэлігентнасць і інтэлігенцыя». Праўда, дапамагалі нам яго правесці доктар юрыдычных навук І. А. Юхо і наш куратар І. І. Доунар. У аснову размовы лягла артыкул В. Катаева. Аднагрупнікі пазнаёміліся з поглядамі на гэтыя паняцці пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, выказалі свае меркаванні. Дыспут быў настолькі вострым, насычаным, што непрыкметна для ўсіх нас выйшаў за межы адведзенага часу.

Дагэтуль успамінаюць студэнты спаборніцтвы па валейболу паміж мужчынскімі камандамі другой і трэцяй груп. І хаця выйгралі нашы сапернікі, цёплыя ўспаміны засталіся ва ўсіх. Дзяўчаты малявалі плакаты і лозунгі, пасля гульні — агульны чай. А з фотаздымкаў зрабілі газету.

Сустрэчы з цікавымі людзьмі, правядзенне дыскусій, абмеркаванні кінафільмаў, паходы ў тэатры і на выстаўкі прыцягваюць амаль усіх нашых сяброў. Мерапрыемствы згуртоўваюць калектыў, яго актыўнасць узнімаецца. У простых справах выяўляюцца пазіцыі кожнага, вылучаюцца актывісты і лідэры. Сярод самых энергічных і адказных хачу адзначыць Таццяну Навумовіч, Андрэя Бурдыку, Аксану Карман.

Не толькі я патрабую аддачы ад сваіх сакурснікаў. Камсамольцы ўзаемапатрабавальныя да мяне і да прафбюро факультэта. У першую чаргу яны жадалі хаця б раз пабачыць прадстаўнікоў прафбюро, якія чамусьці не вельмі спяшаюцца пазнаёміцца з нашай групай. А студэнты ніяк не хочуць запамінаць прозвішчы людзей, аб якіх у іх няма ніякага ўяўлення. Да нас заходзіць толькі Таццяна Бобыш, член прафбюро факультэта, якая распаўсюджвае білеты ў тэатры і кінатэатры. Краем вуха чулі студэнты аб Гене Сітніцы, старшыні прафбюро. А дзе ж астатнія? Карыстаючыся выпадкам, хачу звярнуцца да членаў прафбюро нашага факультэта: ваша дапамога, ваша слова для нас зусім не лішнія!

В. ЧАРАНКЕВІЧ,
прафорг другой групы

Здароўе, бадзёрасць

Прафком сумесна з кафедрай фізічнага выхавання і камітэтам камсамола арганізуе фізкультурна-масавую і спартыўную работу сярод студэнтаў і слухачоў падрыхтоўчага аддзялення.

(З Пастановы Прэзідыума ВЦСПС).

ВАЖНЫМ ФАКТАРАМ умацавання здароўя студэнтаў з'яўляюцца фізічная культура і спорт. За апошнія некалькі гадоў партыя і ўрад прынялі шэраг пастаноў па карэннаму паляпшэнню і развіццю фізічнай культуры і спорту ў нашай краіне. У адпаведнасці з Пастановамі ЦК КПСС і СМ СССР «Аб далейшым уздыме масавасці фізічнай культуры і спорту» і «Аб мерах па паляпшэнню выкарыстання клубных і спартыўных збудаванняў» ва універсітэце распрацавана і зацверджана рэктаратам і парткомам доўгачасовая праграма развіцця фізічнай культуры і спорту. Яна прадугледжвае будаўніцтва спартыўнага комплексу па вуліцы Кастрычніцкай, прывядзенне ўсіх спартыўных збудаванняў у парадак, аснашчэнне іх абсталяваннем і трэнажорамі ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі.

Арганізавана работа 5 клубаў па інтарэсах: рытмічнай гімнастыкі, аматарскага бегу, гіравога спорту, спартыўнага арыентавання і воднага турызму. Значна пашыраны каляндар спартыўна-масавых мерапрыемстваў з акцэнтам на павялічэнне спаборніцтваў паміж вучэбнымі групамі і інтэрнатамі ў выхадныя дні. У каляндар уключаны такія масавыя мерапрыемствы, як «Усёй групай — на стадыён», дні здароўя факультэтаў, тыдні бегуна, лыжніка, плыўца. Пастаўлена задача далучыць да рэгулярных заняткаў фізічнай культурай і спортам да 1990 года не менш як 90 працэнтаў студэнтаў і 60 працэнтаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

У інтэрнатах выдзелены памяшканні для заняткаў фізічнай культурай і спортам. У мэтах прапаганды асноў здаровага ладу жыцця ва ўсіх інтэрнатах абсталяваны спецыяльныя стэнды, якія расказваюць аб шкодзе алкаголю. Пры прафкоме студэнтаў адкрыты пункт пракату спартыўнага інвентару для студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах.

Распрацаваны і ўкаранёны дадатковыя меры па стымуляцыі і павышэнню прэстыжнасці заняткаў фізічнай культурай: узнагароджанне граматамі, пуцёўкамі, значкамі, прызамі і каштоўнымі падарункамі, занясенне прозвішчаў на Дошку гонару.

Вялікая ўвага надаецца пытанням прапаганды і агітацыі фізічнай культуры і спорту. У планах падрыхтоўкі спартыўна-масавых і фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў адно з галоўных займае пытанне афармлення месц спаборніцтваў, парадак апавяшчэння ўдзельнікаў і гледачоў.

З'явіліся новыя цікавыя формы арганізацыі работы сярод студэнтаў: агляды-конкурсы вучэбных груп і інтэрнатаў на лепшую пастаноўку спартыўна-масавай і фізкультурна-аздараўленчай работы.

Сёння спартыўны клуб аб'ядноўвае 11 740 членаў добраахвотнага фізкультурна-спартыўнага таварыства прафсаюзаў БССР. Да разнастайных актыўных заняткаў фізкультурай і спортам далучана больш як 10 тысяч чалавек. У нас развіваюцца 22 віды спорту, у спартыўных секцыях займаецца 5530 чалавек.

У 1984—1986 гадах ва універсітэце падрыхтаваны 2 заслужаныя майстры спорту СССР, 5 чалавек пацвердзілі званне майстра спорту міжнароднага класа, 17 — майстра спорту СССР, 77 — кандыдата ў майстры спорту, 233 спартсмены — першаразраднікі, 5 тысяч значкістаў комплексу ГПА, 3 тысячы студэнтаў сталі суддзямі па розных відах спорту, больш як 2 тысячы студэнтаў набылі навыкі інструктара.

Вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў універсітэта карыстаецца турызм. Штогод у нас праводзіцца 250 паходаў выхаднога дня, у якіх прымаюць удзел больш як 3 тысячы чалавек, і 50—70 — у шматдзённых катэгарыяльных паходах па нашай краіне. Кожны год вялікая група студэнтаў удзельнічае ў зорных паходах па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

Усе гэтыя мерапрыемствы дазволілі актывізаваць спартыўна-масавую і фізкультурна-аздараўленчую работу на факультэтах, у вучэбных групах, інтэрнатах, прыцягнуць да заняткаў фізічнай культурай і спортам значны кантынгент студэнцкай моладзі.

Але, нягледзячы на некаторыя поспехі, якія ў нас ёсць, фізічная культура і спорт не ўвайшлі яшчэ ў жыццё многіх студэнтаў. Мала студэнтаў, асабліва старэйшых курсаў, удзельнічаюць у масавых спартыўных спаборніцтвах, турысцкіх паходах. На факультэтах гістарычным, хімічным, механіка-матэматычным дрэнна арганізавана работа спартыўных секцый і аздараўленчых груп рознай накіраванасці. Амаль на ўсіх факультэтах не праяўлена неабходнай настойлівасці ў выкананні загада рэктара аб увядзенні на занятках вытворчай гімнастыкі. Пакуль толькі першыя крокі зроблены ў паляпшэнні фізкультурна-аздараўленчай работы ў інтэрнатах універсітэта.

А. БАЛДЗІН,
старшыня спартыўнага клуба.

СПОРТ



АБ'ЕКТЫЎ АБВІНАВАЧВАЕ

ПАГЛЯДЗІЦЕ, калі ласка, на гэтую дзяўчыну. «Замарылася» — скажаце вы. Але не, бадай, наадварот. Яна адна з нямногіх, хто ўдзяліў сходу жыхароў студэнцкага інтэрната № 2 хоць якую ўвагу. А астатнія, ад нечага рабіць, не больш, прыйшлі ў лекцыйную залу фізфака. Хоць і гаварылі з трыбуны, што прысутнічаюць тут прадстаўнікі амаль ад кожнага паверха,— гэта далёка не так. Чаму? Адкуль такая няўважлівасць да праблем інтэрната? Ці ж не цікава, чым плануе заняцца ў наступным годзе студэнцкі савет, што новага прапануе жыхарам? Выходзіць, нецікава....

Аб гэтым мы раскажам у наступным нумары.

ТРЫВОЖНЫ СІМПТОМ

ЁСЦЬ КАНТАКТ? НЯМА!

Меркаванні былога старшыні прафбюро гістфака Ларысы БЕЛЬСКАЙ:

— ПАЧНУ З ТАГО, што ў рабоце прафсаюзнага бюро кожнага факультэта да гэтага часу застаецца шмат праблем. Скажу больш: з кожным годам іх колькасць значна павялічваецца. І хутчэй за ўсё не таму, што працаваць мы сталі не ў поўную сілу. Хаця часам здараецца яшчэ і такое. Проста жыццё не стаіць на месцы і патрабуе вырашэння ўсё новых і новых пытанняў. Самае галоўнае з іх, на мой погляд,— наладжванне трывалых кантактаў з пярвічнымі прафсаюзнымі групамі. Азначае гэта не толькі ведаць аб тым, чым жывуць студэнты, але і хутка, аператыўна, своечасова рэагаваць на ўсе прапановы, адказваць на ўсе пытанні.

Асноўная падстава для непакою ў тым, што многія студэнты лічаць прафсаюз фармальнай арганізацыяй, якая збірае ў пэўныя тэрміны ўзносы ды забяспечвае кожнага месячным білетам для праезду ў гарадскім транспарце. Адным словам, не хапае прафсаюзнай арганізацыі аўтарытэту сярод студэнтаў. А калі не хапае, тады, пэўна, ёсць некаторыя недапрацоўкі у нашай дзейнасці. Якія?

Тут многае залежыць ад работы прафорга групы. Так, іменна прафорга. Хто ім можа быць? Той, хто ведае ўсе праблемы сваіх таварышаў, не глядзіць спагадліва з вышыні сваёй пасады, а сам спяшаецца на дапамогу. А як здараецца нярэдка ў нас?

Прафорг аказваецца чалавекам выпадковым у сваёй справе. На першы погляд, свае абавязкі ён старанна выконвае. Памятаеце, якія? Узносы, білеты... А на большае ці то часу не хапае, ці жадання працаваць. Вынік? Ён не прымусіць сябе доўга чакаць. Напрыклад, у самым галоўным для студэнтаў пытанні аб засяленні ў інтэрнат. Ходзіць студэнт у прафсаюзнае бюро, у дэканат, прафком універсітэта. Ні ад каго не сакрэт, што яму трэба будзе абысці вялікую колькасць інстанцый, а тым часам прафорг даведваецца пра гэта апошнім. Так і жыве студэнт адзін на адзін са сваімі праблемамі. І нават не спрабуе адшукаць чалавека, які б дапамог яму, бо лічыць справу гэтую неажыццявімай.

А ці ўсе студэнты ведаюць пра існаванне ў нас сістэмы аздараўлення ў прафілакторыях і санаторыях? Ці шмат груп могуць пахваліцца цікавым і актыўным жыццём? Не. І справа тут не толькі ў тым, што няма сапраўднага арганізатара. Нельга забывацца і на прафсаюзнае бюро факультэта. Здараецца, што адсутнічае цесная сувязь у ланцугу: група — прафсаюзнае бюро, бо выпадае з яго прамежкавае звяно. Пэўна вы ўжо здагадаліся, што ім павінен стаць прафорг. Чаму так атрымліваецца?

Па вопыту сваёй работы ведаю, што шукаць прычыну трэба ў адсутнасці публічнасці. Не ведаюць у групах аб рашэннях факультэцкага прафбюро. А там, у сваю чаргу, і не чулі аб прапановах студэнтаў. Паспрабавалі праводзіць вучобу прафоргаў, на якой абмяркоўваліся пытанні забеспячэння студэнтаў месцамі ў інтэрнаце, арганізацыі культурна-масавай работы. І форму адшукалі незвычайную — прапанавалі прафоргам расказваць аб жыцці і планах сваіх груп, каб дапамагчы кожнаму хутчэй выкарыстоўваць не толькі свой вопыт, але і прапановы калег. Здаецца, рыхтуемся да заняткаў адказна, тэмы шукаем надзённыя, але прыходзяць на вучобу не ўсе. Не ведаюць? Але ж каб даведацца аб чарговым пасяджэнні, трэба толькі зірнуць на стэнд інфармацыі прафбюро. Лічаць непатрэбным? Чаму ж тады пасля ўзнікае ў іх шмат пытанняў? Мабыць, справа ў ленасці і безініцыятыўнасці прафоргаў?

І яшчэ: каб арганізаваць пасапраўднаму цікавае жыццё, трэба жаданне групы. Памятаю, у той час, калі была я на III курсе, шукалі мы новыя формы правядзення адпачынку. І зараз магу сказаць, што мерапрыемстваў дзеля «галачкі» не было. З ахвотай прыходзілі ўсё новыя людзі ў творчую групу, што ўзнікла з самага пачатку. А галоўным арганізатарам была прафорг Святлана Карпава. Потым з падобнымі прапановамі мы паспрабавалі звярнуцца да студэнтаў іншых груп. Але чамусьці адгукнуліся не ўсе. Не назіралася творчага падыходу да прафсаюзнай работы. Хіба не надышоў яшчэ яго час?

Запісала
М. ЗАГОРСКАЯ.
наш кар.

«ДА НАСТУПНАЙ НАРАЧЫ!»

Прафком... кіруе дзейнасцю аздараўленча-спартыўных лагераў.

(З Пастановы Прэзідыума ВЦСПС).

У АДНЫМ з найпрыгажэйшых куткоў нашай Беларусі, на возеры Нарач, знаходзіцца аздараўленча-спартыўны лагер універсітэта, дзе адпачываюць савецкія і замежныя студэнты. Сваю работу лагер пачаў яшчэ ў 60-х гадах. У ім ужо склаліся пэўныя традыцыі. Карысна і цікава можна правесці тут частку сваіх канікулаў.

«Старэнькія» — так тут называюць тых, хто прыязджае не першы раз. Чаму ж аддаюць перавагу студэнты універсітэцкаму лагеру, а не імкнуцца трапіць у лагеры іншых ВНУ (прафком БДУ арганізуе абмен пуцёўкамі з Ерэванскім, Калінінградскім, Львоўскім універсітэтамі)? Чаму не імкнуцца адпачыць на моры? Адказ мне падказала размова дзвюх студэнтак. Адна з іх сказала:

— У нас не бывае бадзяння без справы. Тут кожны можа знайсці свае крыніцы адпачынку.

Так, кожны дзень у лагеры — гэта адпачынак, спорт, прырода. Гэта вялікая работа ўсяго персаналу па ідэйна-палітычнаму выхаванню моладзі, па арганізацыі вучэбна-трэніровачных збораў, аздараўленню студэнтаў з аслабленым здароўем. Пры справе заўсёды і лагерны савет — наш орган самакіравання.

У лагеры вельмі сур'ёзна ставяцца да арганізацыі насычанага, цікавага дня. Такімі павінны быць усе дні змены.

Дзень Няптуна чакаюць з выключнай цікавасцю. У гэтым свяце ўдзельнічаюць усе, нават кухня пустуе. Праведзеная папярэдне падрыхтоўка выліваецца ў цудоўнае відовішча. І спорт, і культурная праграма, і водныя працэдуры. Самы востры момант свята — купанне ўсяго лагернага (нават універсітэцкага, калі такое на даны момант ёсць у лагеры) кіраўніцтва. Весела, па-студэнцку хораша і проста.

А хіба можна забыцца пра турысцкія паходы? Ноч каля вогнішча, мора чарніц і маліны — толькі руку працягні. Не забываюцца ў лагеры і пра спорт, які тут займае ганаровае месца. Кожная раніца пачынаецца аэробікай для дзяўчат і інтэнсіўнай зарадкай для хлопцаў. Кожны дзень — спаборніцтвы: валейбол, баскетбол, настольны тэніс, футбол, крос, шахматы, плаванне, лёгкаатлетычная эстафета...

З задавальненнем выходзяць студэнты на палі падшэфнага калгаса «Нарач». Зароблены грошы пералічваюць у Фонд міру.

З кожным годам мацнее матэрыяльна-тэхнічная база лагера. Думаецца, у хуткім часе будзе пашырана танцпляцоўка, будзем мець і свой гарачы душ. Праблема будаўніцтва стацыянарнага лагера, замацаванне за ім тэрыторый і пашырэнне штатаў — не з новых. Гэта рэчы відавочныя. Але іх вырашэнне патрабуе часу. Пакуль жа... Лагер працягвае карыстацца папулярнасцю сярод студэнтаў. Нарач, з такой на дзіва празрыстай вадой, лес, поўны падарункаў прыроды, побач з лагерам — басейн з саунай, кінатэатр... Штогод прыязджаюць сюды студэнты нашага універсітэта. Для іх Нарач — гэта цікавы адпачынак, новыя сябры, выдатнае здароўе, добры настрой, загар, не горшы паўднёвага, цэлы тузін успамінаў. І я добра разумею, чаму на развітанне тут кажуць не «бывай», а часцей:

— Да наступнага лета! Да наступнай Нарачы!

А. КЛОКАВА,
старшыня савета лагера «Нарач».

УСПАМІН НА БУДУЧАЕ

«КРЫЖАЧОК» ЖЫВЫ ЖАДАННЕМ РАДАВАЦЬ

ВЕЛЬМІ ДОБРА, што з'явілася магчымасць сказаць некалькі слоў пра наш калектыў.

Вось ужо 40 гадоў існуе ва універсітэце танцавальная група, якая называецца «Крыжачок». За гэты доўгі час «Крыжачок» дасягнуў многіх вышынь, дабіўся поспеху і прызнання, на яго лёс выпала шмат падзей, якія назаўсёды застануцца ў сэрцах тых, хто прыходзіў і прыходзіць увечары ў залу, каб усёй душой увайсці ў цудоўны свет танца. Дзяўчаты і юнакі з захапленнем выконваюць беларускія, украінскія, малдаўскія, а таксама танцы народаў свету. І гэта сапраўканцэртаў, забеспячэнне касцюмамі, падтрымка — гэта адносіны клуба да нас. І так хочацца часам сказаць: «Што б мы без вас рабілі!» І яно так. Але ж у некаторых справах і студэнцкі клуб не можа нічога. Ён проста бяссільны ў гэтым. Думаю, што выкажу не толькі ад сябе, але і ад многіх удзельнікаў мастацкай самадзейнасці наступную думку.

Увесь час усе гавораць пра тое, што мы павінны прапагандаваць сваё мастацтва. А дзе яго прапагандаваць? Клуб павінен яшчэ таксама прыцягваць як мага больш студэнтаў у калектывы, што ён і робіць. А як прыцягваць?

Усім, хто займаецца ў калектывах, цікава паглядзець на рэзультат сваёй працы, пазнаёміцца з творчасцю, культурай іншых народаў. Іншымі словамі, паехаць у другія рэспублікі. Я ўпэўнена, што наш студэнцкі клуб з радасцю б арганізаваў такія канцэрты. Але ёсць адна перашкода. І немалая — грошы. Дзе іх узяць, каб аплаціць расходы паездак? Дзе?

А чаму нам не арганізаваць сумесныя святы? Кіраўнікі клуба пойдуць нам насустрач.

Гэтыя агульныя праблемы не толькі нашы — праблемы маральнай і матэрыяльнай падтрымкі калектываў. Ёсць у нас і ўласныя праблемы, адна з іх — абнаўленне калектыву і адначасова захаванне гадамі назапашаных традыцый.

У заключэнне мне хацелася б сказаць, што нідзе так не раскрываецца чалавек, як у танцы, песні. Прыходзьце, калі ласка, да нас. Будзем рады ўсім!

Н. ЯНУШКЕВІЧ,
удзельніца ансамбля «Крыжачок».

Неаднойчы ансамбль прадстаўляў мастацтва Беларусі, нашай краіны за іх межамі — у Балгарыі, ГДР, ПНР, Аўстрыі, Англіі, Аўстраліі, Новай Зеландыі. І ва ўсіх краінах, такіх розных па свайму ўкладу, наш ансамбль прымалі на «біс». Мова танца даступная ўсім, як і мова мастацтва ў цэлым. І не выпадкова зараз у свеце ўсё больш гавораць пра тое, што мастацтва, спорт — «галубы міру». І вельмі прыемна адчуваць сваё дачыненне да гэтай вялікай справы.

За ўвесь час існавання, як я ўжо адзначала, ансамбль дабіўся многага: ён — лаўрэат усесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў, лаўрэат сусветнай асацыяцыі універсітэтаў, дыпламант XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве. Аб апошнім немагчыма не сказаць асобна. «Крыжачок» быў удзельнікам культурнай праграмы фестывалю. На канцэрты збіралася да тысячы гледачоў у павільёне Беларускай ССР, у Парку мастацтваў, на пляцоўках горада, у клубе венесуэльскай дэлегацыі і іншых месцах.

Стваральнікам нашага калектыву быў заслужаны работнік культуры БССР Мікалай Вікенцьевіч Лапша. Многім абавязаны яму ансамбль. Зараз кіраўніком ансамбля плённа працуе Мікалай Васільевіч Харламаў.

Усе справы ансамбля знаходзяцца пад чулай увагай студэнцкага клуба. Арганізацыя

Студыя сучаснага бальнага танца

— адзін з новых маладзёжных калектываў мастацкай самадзейнасці універсітэта. Модныя танцы неабходны моладзі, як паветра, бо яны даюць магчымасць выявіць сябе ў руху. Аднак у танцы, як у спорце, у дапаўненне да таленту і натхнення патрэбна тэхніка. Таму ў праграму работы студыі ўваходзяць харэаграфічная падрыхтоўка ўдзельнікаў, выступленні ў конкурсах і канцэртах. Ад класічных еўрапейскіх танцаў да запальных лацінаамерыканскіх рытмаў, ад павольных джазавых варыяцый да рок-н-рола, ад вясёлай полькі да вострасучаснага брэйка — такі дыяпазон танцаў свету, якія выконваюць удзельнікі студыі.

З захапленнем займаюцца ў калектыве людзі розных узростаў. Бо танец больш, чым іншае захапленне, дазваляе людзям уступаць у кантакты, дапамагаючы іх знаёмству. Нават самаму баязліваму чалавеку дастаткова

месяца, каб знайсці ўпэўненасць у рухах.

Тых, хто хоча навучыцца танцаваць сучасныя танцы, студэнцкі клуб універсітэта запрашае ў падрыхтоўчую групу студыі.

М. ПРОДАН,
кіраўнік студыі сучаснага бальнага танца.

... ад вясёлай полькі да вострасучаснага брэйка...
...І гэта сапраўды пазнанне гісторыі народаў...
Свет тваіх захапленняў
...Ёсць людзі з нераскрытым талентам...
...дачыненне людзей да музыкі робіць іх лепшымі...

Ці любіце вы тэатр?

Я — З ТЭАТРА. Я — адна дваццаць пятая моцнага, дружнага, вясёлага і працавітага «мы» студэнцкага тэатра-студыі БДУ. Мы — жывём і вучымся разам з вамі. Вы павінны ведаць нас па спектаклях «Бяда ад лішчотнага сэрца» Салагуба, «Юбілей» Чэхава, «А світанкі тут ціхія...» Васільева...

Мы — неспакойныя дзівакі, чыё паветра, вада і хлеб — тэатр, тэатр, тэатр.

Мы шукаем...— не, не таленты! Бо на нашаму цвёрдаму перакананню, выхаванаму ў нас Барысам Пятровічам Уторавым — нашым рэжысёрам — неталенавітых людзей няма! Ёсць людзі з нераскрытым талентам. Мы шукаем апантаных, такіх, як мы самі. Хто змог бы, калі трэба, працаваць ноччу і ў час сесіі, рэпетыраваць нават напярэдадні экзамена. Хто змог бы забыцца аб адпачынку, аб асабістых хваляваннях — аб усім на свеце (акрамя вучобы). Хто змог бы спяваць, чытаць, скакаць, а таксама шыць, мыць, сталярнічаць, паяць, сячы, будаваць, маляваць, страляць, ляпіць, паказваць фокусы і рабіць цуды, і многае-многае іншае! Калі вы нічога не ўмееце, тым больш прыходзьце да нас: навучым!

Мы вельмі жывучыя: спачатку ў вялікай фізічнай, дзе мы займаліся, пад намі зламалася паліца, калі мы марна вучылі сваіх хлопцаў танцаваць мазурку. Мы мужна перажылі гэту непрыемнасць. Потым — ужо не па нашай віне — над намі абваліласяся столь. Ахвяр не было — і гэта мы перажылі. Нарэшце нам далі пляцоўку і маленькі пакойчык. Мы навялі там парадак, засяліліся і зажылі лепш ранейшага. Потым мы вялі бяскроўныя, але жорсткія баі за касцюмы, апаратуру — і з гонарам выйшлі з гэтага змагання. Апаратуру нам далі! Новенькую, хаця і са спазненнем на год. Мы не вымерзлі, іграючы пры амаль нулявой тэмпературы ў памяшканні. Саграваля нас натхненне! Мы не патанулі ў шторм і не перагрэліся на сонцы ў Адэсе, куды ездзілі на гастролі. Колькі юнакоў пайшло ад нас у армію! Але і тут мы не здаваліся, хаця іх у нас катастрафічна не хапае. Мы чакаем сваіх юнакоў — і яны вяртаюцца ў тэатр!

Мы вельмі жывучыя! Цяпер вось нас выгналі і з памяшкання інстытута народнай гаспадаркі (па невядомай нам прычыне). Але мы будзем жыць! Тым больш, што нам абяцаюць даць падвал пад першым інтэрнатам. Але мы ўжо бачым у ім наш будучы тэатр. Мы пабудуем яго сваімі рукамі, свамі сэрцамі, калі гэта спатрэбіцца. Зараз нам, як ніколі, патрэбна дапамога. Прыходзьце да нас! Толькі ад усёй душы! А за гэта — будзеце іграць у нашых будучых спектаклях толькі галоўныя ролі, таму што ў сапраўдным тэатры няма негалоўных роляў.

Л. ЛЕВУШ,
удзельніца народнага тэатра, студэнтка філалагічнага факультэта.

Песня — душа народа

АЛЕ, НА ЖАЛЬ, усё менш і менш знаходзіцца людзей, якія любяць спяваць. Я маю на ўвазе спяваць у хоры. Асабліва ў акадэмічным. Сапраўды, жанр акадэмічных харавых спеваў перажывае крызіс. На гэта ёсць і аб'ектыўныя прычыны: слабая прапаганда харавой музыкі прафесійнымі калектывамі (якіх усяго два ў Мінску). І другая прычына — слабая зацікаўленасць кіраўнікоў факультэтаў ва удзеле студэнтаў у мастацкай самадзейнасці. На жаль, словы аб ролі мастацтва ў справе выхавання людзей успрымаюцца імі недастаткова сур'ёзна. Да прычын, якія перашкаджаюць нармальна развівацца калектывам, можна аднесці і адсутнасць памяшканняў для работы, адсутнасць інструментаў.

Жанр акадэмічных спеваў многія успрымаюць як нешта недаступнае, складанае. Спевы хорам на чатыры і болей галасоў — гэта сапраўды вельмі складана, ды яшчэ і спецыфіка вакалу, якая патрабуе доўгай і часам нуднай работы, мала каго можа зацікавіць.

Але ж любая работа патрабуе настойлівасці, стараннасці. Смела можна сказаць, што спевы ў акадэмічнай манеры правяраюць характар чалавека, уменне перамагчы сябе. Таксама смела можна сцвярджаць, што гэта работа дае самыя нечаканыя вынікі. А галоўнае — радасць якасна выкананага твора.

Наша капэла спявае разнастайную праграму: ад твораў майстроў XVII—XVIII стагоддзяў да песень «Бітлз», рускую і беларускую класіку, народныя песні. Кожны твор патрабуе асаблівага падыходу, тонкай перадачы духу і зместу.

Безумоўна, дачыненне людзей да музыкі робіць іх лепшымі, больш добрымі. Магчымасць выканання музыкі розных эпох робіць шырэйшым іх кругагляд.

Спевы наогул (гэта ўжо даказана медыкамі) добратворна ўплываюць на арганізм чалавека, паляпшаюць яго настрой і адпаведна здароўе.

Але самае галоўнае багацце — гэта людзі! Якія надзвычайныя ў нас юнакі і дзяўчаты! Нішто так не аб'ядноўвае людзей, як пераадоленне цяжкасцей разам, як радасць сумеснай творчасці.

Вельмі хацелася, каб студэнты, якія прачытаюць гэты допіс, зацікавіліся і прыйшлі ў наш калектыў.

І. МАЦЮХАЎ,
мастацкі кіраўнік народнай харавой капэлы.

ПРАГРЭС У ПАНТАМІМЕ?

ЗУСІМ НЯДАЎНА здавалася, што мастацтва пантамімы набыло сваю канчатковую форму і стала такім жа пазнавальным, як, скажам, кітайская опера ці танец мадэрн. Усемагчымыя крокі на месцы, хвалі, уяўныя сцены і прадметы сталі сімваламі, і сімваламі ў вядомай ступені адыёзнымі.

На самай жа справе гэта быў проста застой. Сёння прычына відавочная: формы, выпрацаваныя ў свой час класікамі, якія нясуць на сабе каларыт пачатку XX стагоддзя, непазбежна састарэлі. Мова пантамімы адстала ад бурных рытмаў сучаснасці.

Дзве праблемы неадольна паўставалі на шляху любой спробы развіцця пластыкі — засваенне гарызантальнай плоскасці і засваенне вертыкальнай выразнасці. Класічная пантаміма прывязана да кропкі, а што датычыць вертыкальнай выразнасці — то яна практычна адсутнічае. Самае галоўнае яшчэ тое, што ніякаму рашэнню не паддавалася праблема тэмпу. Агульнавядома, што хуткасць — гэта неад'емны элемент сучаснага мастацтва, ды і наогул сучаснасці.

Усе гэтыя невырашальныя праблемы далі падставу нявесела пажартаваць аднаму з прафесіяналаў: «Пантаміма — вельмі спрыяльнае мастацтва, тут можна рабіць выгляд, што крочыш наперад, застаючыся на месцы».

На наш погляд, становішча не такое безнадзейнае. Трэба прызнаць удалымі эксперыменты ў брэйк-дансе, флэшэ і іншых навейшых пластычна-танцавальных павевах. Пластыцы цяпер стаў даступны вопыт акрабатыкі, хатха-ёгі, кітайскай нацыянальнай барацьбы ушу, другімі словамі, спосабаў падрыхтоўкі, якія цяпер у тым ці іншым выглядзе выкарыстоўваюцца і засвойваюцца ў вялікім спорце.

Так што цяпер пытанне заключаецца не ў прызнанні ці непрызнанні тэхналогіі руху, а ў вывучэнні і правільным прыкладанні,— а вось з гэтым як раз складана. «Фірменнае» адценне пагражае ператварыць плён мастацтва і працы прафесіяналаў у прэстыжную цацку і толькі.

Застаецца дадаць, што ў гэтым годзе ва універсітэце арганізуецца студыя з мэтай навучання новай пластычнай тэхналогіі і вывучэння ў практычных эксперыментах магчымасцей «жыцця ў мастацтве». Задача складаная, але і захапляючая, якая патрабуе ўдзелу сапраўдных энтузіястаў. А ў тым, што такія ёсць, аўтар заметкі, сам у мінулым студэнт універсітэта, абсалютна не сумняваецца.

Д. КАРЭНКА,
кіраўнік студыі пантамімы.

ДРУГІ ДОМ ЯК РОДНЫ!

Прафком удзельнічае ў распрацоўцы планаў будаўніцтва і рамонту інтэрнатаў... жыллёвая плошча прадастаўляецца студэнтам па сумеснаму рашэнню рэктарата, прафкома і камітэта камсамола ВНУ.

(З Пастановы Прэзідыума ВЦСПС).

БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ імя У. І. Леніна мае ў сваім карыстанні 8 студэнцкіх інтэрнатаў, у якіх пражывае звыш 5000 чалавек, з іх амаль 4600 савецкіх студэнтаў і звыш 500 замежных.

Студэнцкі інтэрнат — вось яшчэ адна сфера дзейнасці прафсаюзнай арганізацыі. У прафкоме ёй надаецца вялікая ўвага. Рэдкае пасяджэнне абыходзіцца без абмеркавання гэтага пытання. На жаль, з вельмі вялікім пытальнікам у канцы.

У бягучым годзе працэнт заселеных у інтэрнаты студэнтаў ад колькасці іншагародніх склаў 81. Калі параўнаць з 1984 годам (67 %), то гэта значны крок на шляху паляпшэння жыллёвых умоў студэнтаў. Уведзены ў эксплуатацыю новы інтэрнат. Гэта дазволіла палепшыць жыллёвыя ўмовы аспірантаў універсітэта, студэнтаў інтэрната № 4, дзе раней у невялікіх пакоях жыло 4—5 чалавек. З мёртвай кропкі зрушылася яшчэ адна наша праблема. Аб прадастаўленні пакояў студэнцкім сем'ям. Доўгі час гэта было балючым пытаннем у рабоце прафкома. Сёння 30 сем'яў савецкіх студэнтаў заселены ў інтэрнат № 4. Разумеем, што 15—20 % ад усёй актуальнай колькасці студэнцкіх сем'яў — гэта такой вучэбнай установы, як наша, малавата. Таму і ў бягучым годзе гэтаму пытанню

ТУЗІН СКЛАДАНАСЦЕЙ

будзем надаваць асаблівую ўвагу. Відавочна, што без будаўніцтва яшчэ аднаго-двух інтэрнатаў на 500—600 месц нам ніяк не абысціся.

Пра будучае гаварыць лёгка. Марыць заўсёды так хораша! А што мы маем сёння? Восем інтэрнатаў і цэлы тузін пытанняў, цяжкасцей, складанасцей. Кожны навучальны год пачынаецца традыцыйнай надакучлівай мелодыяй няскончаных капітальных і бягучых рамонтаў. Планы, дамоўленасці аб завяршэнні падобных работ да 1 верасня так і застаюцца планамі. На сённяшні дзень гэтыя работы ў інтэрнатах №№ 4, 5 не завершаны! Быццам і прычына вядома: аб'екты універсітэта, у тым ліку і інтэрнаты, ідуць у планах рамбударганізацый гораду «іншыя». Школы, жылыя дамы, лячэбныя пачынаюцца першаступеннымі, а інтэрнаты «іншымі». Трэба ж неяк вырашаць гэту праблему!

«Чужы дзядзька» не жадае нас рамантаваць. А мы самі што робім? Не сядзім, не. Мінулым летам быў створаны атрад па рамонту інтэрната № 6, які працаваў і ў інтэрнаце № 2. Летась папрацавалі дзяўчаты. Ад тушы папрацавалі і студэнты-юрысты ў інтэрнаце № 4, усімі сіламі імкнучыся дапамагчы, каб рамонт інтэрната быў завершаны ў тэрмін.

Кожны год выходзіць загад рэктара аб стварэнні груп садзейнічання рамонту інтэрнатаў, іх падрыхтоўкі да засялення ў час сельскагаспадарчых работ. Выконваецца ён у лепшым выпадку працэнтаў на 50. У выніку недаробкі так і застаюцца. А калі і ствараецца група, то не заўсёды яна мае фронт работ. Вось вам неахайная (толькі б адчапіліся) арганізацыя важнай справы.

Мы заўсёды гаворым аб паляпшэнні бытавых умоў. Можа ўжо час стварыць сваю арганізацыю па рамонту? Думаю, у БДУ працы для яе хапіла б на цэлы год.

І яшчэ трошкі пра быт. Вось ёсць у інтэрнатах міжгародныя тэлефоны-аўтаматы. Добра, зручна, нікуды бегчы не трэба. У інтэрнаце № 6 працуе майстэрня па рамонту абутку. Зноў жа: зручна. А ці лішнімі былі б іншыя службы быту? Напрыклад, хімчыстка, пракат тэле- і радыёапаратуры і г. д.? Іменна ў інтэрнатах, а не дзе-небудзь на раёне.

Усе ўзнятыя пытанні ў значнай ступені залежаць ад вышэйстаячых органаў. А ад студэнтаў патрабуюцца беражлівыя адносіны да свайго дома. Думаю, што эпітэт «невырашальныя» да ўзнятых пытанняў-праблем не падыходзіць. Мы гэта можам вырашыць. Мы павінны вырашыць!

П. ЛАПЦЕНАК,
намеснік старшыні
прафкома студэнтаў.

«А нам спадабалася»

«ФЕАДАСІЙСКІ»

ВЕСЕЛА праляцела першая змена ў лагеры працы і адпачынку «Феадасійскі». У гэтым лагеры штогод студэнты працуюць і адпачываюць па пуцёўках прафкома універсітэта. Сумесная праца, адпачынак з'ядналі рабят з розных факультэтаў. Шмат уражанняў прывезлі з сабой студэнты з Чарнаморскага ўзбярэжжа.

Многія, можа, дагэтуль ніколі не бачылі, як растуць вінаград, міндальныя арэхі. А цяпер нам давялося гэта не толькі пабачыць, але і асабіста прыняць удзел у зборы ўраджаю. Спачатку не ўсё добра атрымлівалася: вельмі моцна пякло сонца, балелі рукі. З цягам часу гэта проста перасталі заўважаць, і працаздольнасць павысілася. І норма не здавалася ўжо такой вялікай і недасягальнай, як у першыя дні.

А пасля працы — цікавы адпачынак, насычаны паездкамі, вясёлымі мерапрыемствамі. Шмат даведаліся аб Крымскім паўвостраве, аб Феадосіі, аб вёсцы Насыпнае, у якой базіраваўся лагер. Наведалі музей Аляксандра Грына ў Феадосіі і яго домік, таксама пабывалі на выстаўцы твораў Айвазоўскага.

Нашай брыгадзе даручылі падрыхтаваць канцэрт да адкрыцця лагера. Спачатку мы разгубіліся, не чакалі такога. Але канцэрт атрымаўся. З ім пазней выступілі перад жыхарамі вёскі.

Нельга забыцца пры дзень Няптуна. Сапраўднае свята выйшла. Увесь лагер накіраваўся ў Ціхую бухту з начоўкай. Я і цяпер успамінаю гэты паход. Нам праведзеная ля вогнішча з песнямі пад гітару, з цікавымі расказамі, з танцамі на беразе мора, яшчэ болей здружыла нас. Гэта і было нашай рамантыкай, да якой так імкнецца моладзь.

А ўжо на другі дзень было разыграна прадстаўленне. Студэнтка IV курса філфака Люба Ляўшук напісала незвычайны сцэнарый да гэтага свята, мы прыдумалі касцюмы, адрэпеціравалі — і атрымалася вельмі весела.

Можна доўга і шмат чаго расказваць пра змену. Лічым, што нам пашанцавала. Спадзяемся, што гэта была не апошняя змена ў ЛПА «Феадасійскі».

А. СУХАДОЛЕЦ,
студэнтка ФПМ,
І. КРУШЫНСКАЯ,
студэнтка фізфака.

ЕСЦЬ ПЫТАННЕ!

Чэлентана і... ЛПА

— ПАД МУЗЫКУ Андрыяна Чэлентана загрузіліся у прадастаўлены транспарт...

Такімі словамі камандзіра пачынаўся кожны дзень у лагеры працы і адпачынку «Феадасійскі», дзе працаваў зводны атрад універсітэта. Пад музыку ўставалі і беглі ўмывацца, з Чэлентанам нас праводзілі ў сталоўку, ім жа сустракалі з працы і, нарэшце, засыналі пад яго закалыхваючыя мелодыі. А без музыкі мы толькі працавалі на полі: падвязвалі лазу, збіралі персікі і цыбулю. Без Чэлентана выбраны савет брыгадзіраў вёў улік выкананай працы. І без голасу спевака казначэй, стараста, медінструктар і іншыя адказныя асобы займаліся сваімі справамі.

Хочаце ведаць, як мы адпачывалі? У нас быў насычаны плансетка: чаго ў ім толькі не было намечана! Але пасля некалькіх няўдалых спроб з боку кіраўніцтва арганізаваць Дзень Няптуна (трэба было для гэтага дамовіцца з саўгасам аб аўтобусе) быў узяты курс на самастойнае часаправядзенне.

Не падумайце, што мы сядзелі і чакалі, пакуль нам нешта прапануе нехта. Не. На Чарнаморскім узбярэжжы наогул цяжка знудзіцца: ездзілі на экскурсіі, хадзілі ў мясцовыя дыскатэкі, гулялі ў валейбол. Але моцнага сяброўства ў нашым калектве не было. На першай нарадзе брыгадзіраў нам шматразова паўтаралі: ад таго, якім будзе адкрыццё змены, залежыць яе працяг. Нядрэнным было адкрыццё, але ў далейшым мы так і не аб'ядналіся, не змаглі.

Напісала я пра наша жыццё не з мэтай ачарніць наша кіраўніцтва, а каб, прачытаўшы гэта, яны таксама задалі сабе пытанні: «А можа мае рацыю змена сістэмы кіраўніцтва? Чаму б не паспрабаваць увесці ў ЛПА будатрадаўскае самакіраванне?» І яшчэ адна заўвага-прапанова. Падрыхтоўчы перыяд павінен быць больш насычаным і ўключаць у сябе такія формы гутарак, сходаў, якія б дапамаглі ўжо да выезду стварыць іменна атрад, раскрыць магчымасці і здольнасці тых, каму змену разам жыць, працаваць і адпачываць.

В. КАРАЛЕНКА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

ЗАПРАШАЕ ПРАФІЛАКТОРЫЙ

МЕНШ СЛОЎ — больш справы. Па гэтаму прынцыпу працуе калектыў прафілакторыя, які ўзначальвае галоўны ўрач М. Б. Канапелька. Красамоўней шматлікіх слоў — канкрэтная лічба. 1423 чалавекі палепшылі сваё здароўе толькі за мінулы год. Выразней доўгіх сказаў — прапануемы фотарэпартаж аб дзейнасці працавітага калектыву. Вышэйшая ўзнагарода якому — словы ўдзячнасці адпачыўшых. Кніга падзяк прафілакторыя запаўняецца шчырымі словамі кожны дзень.

Так трымаць!

ФОТАРЭПАРТАЖ *С. ПЛЫТКЕВІЧА.*



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа

30 кастрычніка 1986 г.

АТ 07610. Зак. 1245.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.